Год II. Пятніца, 14 Студня (января) 1921 г. № 2.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 60 марак або 5 ф. мукі. | Цана асоб. нумэру 5 марак. | Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Новая кніга | М. ГАРЭЦКІ. | Новая кніга

Гісторыя беларускае літэратуры

(Старадаўнае, новае і сучаснае).

Выйшла з друку і прадаецца ў лепшых кніжных крамах Вільні. Склад на Вострабрамскай, 5 (Пасаж). 208 стр., 33 рысункі, альбомная папера, цьвёрдая вокладка. Цана 100 марак.

„ТРЭЦЯЯ СТАРАНА“ і МЫ.

Каму няведама, што пасьля сусьветнай вайны утварылася на Божым сьвеце так званая Ліга Народаў і што яна складаецца далёка ня з усіх народаў, а толькі з тых, хто ці дзелам ці хоць бы словам памагаў Антанце перамагчы немцаў.

На чале Лігі Народаў стаяць вялікія дзяржавы, а меншыя і маленькія дзяржавы і дзяржаўкі ідуць за вялікімі ў хвасьце.

Але ёсьць і такія дзяржавы, паўстаўшыя нядаўна на руінах Царскай Расеі, каторыя ў Лігу Народаў зусім ня прыняты. Гэта — Эстонія, Лацьвія, Літва, Беларусь, Украіна і іншыя. Ім адмовілі ў прыняцьці..., бо ёсьць ці можа будзе калі-сь нейкая „трэцяя старана“, каторая покуль-што не сядзіць за сталом Лігі Народаў, але можаць засесьці за ім пры вядомых варунках і моцна пераважыць не на карысьць няпрынятых.

Ліга Народаў ужо даўно чакае к сабе у госьці трэцюю старану, г. ё. Расею „единую и недѣлимую“, і ніяк ня можа дачакацца.

Сколькі патраціла бедная Ліга Народаў усялякіх матар‘яльных і духоўных сіл, каб скарэй дачакацца к сабе ў госьці гэтай трэцяй стараны. А яна усё не прыходзіць і ня прыходзіць...

Ненавісныя Лізе Народаў бальшавікі моцна трымаюцца і ня хочуць здавацца ні „трэцяй старане“ — „единой, недѣлимой“, ні самой Лізе Народаў.—„Сярэдняя Літва“... Канфлікт паміж Польшчай і Літвой за права на валаданьне Сярэдняй Літвой. Умешваецца Ліга Народаў і, пасьля доўгіх спорак па пытаньню аб прыналежнасьці тэрыторыяў так званай Сярэдняй Літвы, пастанаўляе зрабіць плебісцыт.

Плебісцыт — дык плебісцыт...

Але потым апомнілася Ліга Народаў... Забылася, што ёсьць ці будзе „трэцяя старана“. Надзеі на яе прышласьць у Лігі народаў, відаць, яшчэ моцныя, калі ўвесь гэты палітычны клубок нашай сярэдня-літоўскай Македоніі адкладаецца да мамэнту, які няведама калі прыдзе.

Мы раней *) выказалі свае думкі па пытаньню аб плебісцыце і сойме у Сярэдняй Ліцьве. Мы лічым, што ні Сойм ні плебісцыт пры тых варунках іх правядзеньня, якія нам ведамы і на штучна выкраенай тэрыторыі ня могуць быць праведзены, бо гэта парушыла б правы беларускага народу.

Цяпер, замест Сойму ці плебісцыту Лігай народаў высоўваецца „трэцяя старана“, г. ё. Расея.

На нашае зданьне, і з гэтага нічога ня выйдзе. Мы цьвёрда пракананы, што пакуль Ліга Народаў ня стане на грунт прызнаньня дзяржаўнай незалежнасьці аддзельных народаў і іх раўнапраўнасьці сярод Лігі Народаў, нічога путнага з яе палітыкі ня выйдзе.

Ясна, што палякі, ліцьвіны і беларусы—асобныя народы, засяляючыя кожны сваю зямлю. Але Ліга Народаў лічыцца ня з гэтымі трыма, а з Расеяй.

Відаць, што палітыкі Лігі Народаў, прывыкшыя рабіць у сваей палітычнай ігры стаўку на „мертвыя душы“—Колчака, Дэнікіна і Врангеля, хочуць адыграцца на апошняй стаўцы, „трэцяй старане“...

А. Б.

*) № 2 «Нашае Думкі» за 1920 г. у стацьці «Віл. Сойм, плебісцыт і беларусы.»

Загадка маскоўскіх камуністаў.

Аднэй з вялікіх абмылак у дзеяльнасьці маскоўскіх бальшавікоў было тое, што яны глядзелі на новыя гаспадарствы, паўстаўшыя на ўзьмежках былой Расейскай Імпэрыі, без належнай павважнасьці.

Нацыянальнае пытаньне ў адносінах да гэтых гаспадарстваў бальшавіцкая Масква разьвязывала не па праграме партыі бальшавікоў.

Бальшавіцкія кіраўнікі ня ведалі добра, як у гэтай справе кіраваць, і сваю нацыянальную палітыку будавалі на бліжэйшай, часовай карысьці.

А мала-культурныя спаўніцелі іх волі, яшчэ наскрозь прапітаныя царскарэжымным духам у гаспадарсьцьвенай практыцы і зазвычай прыблуды ў чужым краі, здабывалі тую карысьць спасабамі царскага рэжыму.

Гэтыя людзі, акрыўшы ўсе свае, без разбору, учынкі пеляною дыктатуры пролетар‘ята, душылі духоўнае адраджэньне паняволеных нацый.

Інтэрнацыяналісты на словах, яны аказаліся на дзеле страшэннымі контррэволюцыянэрамі ў нацыянальным пытаньні.

Для часовых патрэб свайго далейшага быцьця яны аказаліся такімі не з пагляду буржуазных ці дэмократычных партый, а з пункту свае ўласнае праграмы.

Гэтыя людзі бачылі ў нацыянальнай, праз іх абмылкі паўстаўшай вайне, вайну клясавую, а справу адраджэньня нацый уважалі за справу выключна буржуазных інтарэсаў.

І хоць бальшавіцкая Масква быццам для фасону мела ўсякія правы для „нацыянальных меншасьцяў“, навет нейкія адмысловыя ўстановы для іх патрэб, аднак, яна, дзе толькі перамагала на тэрыторыі гэтых „нацыянальных меншасьцяў“, зараз завадзіла: у думцы інтэрнацыянал, а на практыцы — чысьцейшую маскоўшчыну.

І яна тут памагала не падзелу нацыі на буржуазію і сьвядомы пролетарыят, а дружнаму аб‘яднаньню ўсіх класаў у справе абароны іх агульна-нацыянальных духоўных інтарэсаў.

Праўда, пры гэтым процэсе адбываўся болей-меней і процэс чыста клясавых зьявішч.

Ды ўрэшце, праз тую, казаную, сьлепату кіраўнікоў бальшавіцкае Масквы і няўмельства спаўніцеляў іх волі, бальшавізм, замест натуральных прыхільнікаў, знайшоў сярод паўстаўшых гаспадарстваў сваіх найчасьцей, нявольных, але фанатычных ворагаў.

А не забывайцеся, што ў быўшай Расейскай Імпэрыі найбольш было рэволюцыйнасьці на яе „ўскрайках“.

Дык праз нацыянальную палітыку маскоўскіх бальшавікоў гэтая рэволюцыйнасьць не пайшла ім на карысьць.

Праз тую, казаную, сьлепату і няўмельства шмат разьлілося пролетарскае крыві, з аднаго боку і з другога боку, бяз усякае патрэбы.

Чаканая маскоўскімі бальшавікамі социяльная рэволюцыя ў паўстаўшых гаспадарствах, бязумоўна, праз гэтую прычыну зрабілася менш магчымай ці болей аддалёнай.

З бегам жыцьця маскоўскія бальшавікі сталі заўважаць „маленькие недостатки механизма“ ад нацыянальнага вінта. Агульна-эўропэйскае палітычнае становішча таксама спрычынілася ў гэтай справе, і вось пачынаецца абвешчаньне незалежных савецкіх рэспублік з увааходам іх у Расейскую Федэрацыю.

На шкоду, дзеля прычын, падобных да вышэй апісаных, і тое абвешчаньне ніколі ня было дастойна ідэалаў камунізма.

Часам, як з Беларусьсю першы раз, яно выглядала навет не палітычнай камэдыяй, патрэбнай для справы, а прост нейкім скалазубствам людзей, маючых на дзеле дужа мала супольнасьці з запраўдным камунізмам.

З далейшым бегам жыцьця маскоўскія камуністы пераверыліся, што ад нацыянальнага пытаньня палітычнымі фокусамі не адкупішся. І вось, пабітыя на фронтах „меншасьцяў“ нацыяналізмам, падмацаваным іхнаю-ж палітыкай, маскоўскія камуністы хапіліся за розум: сталі мірыцца, прызнаваць незалежнасьць, даваць золата цэлымі вагонамі, адным словам, рабіць усё тое, што ім трэба было рабіць з самага пачатку нацыянальнай палітыкі.

Тымчасам, і на іх гэтым новым кірунку, ёсьць адно зьявішча, якое прадстаўляецца нам дзіўной загадкай. Трудна згадаць, ці тут зноў абмылка ў сьвядомай рабоце для патрэб палітыкі ці проста інэрцыя праз няведаньне запраўднага становішча на данай тэрыторыі.

Мы гаворым аб тэрыторыі ўсходняе Беларусі.

У пачатку 1919 году, абвяшчаючы першы раз незалежную савецкую Беларусь, бальшавіцкая Масква зрабіла дзікі ўчынак: Смаленшчыну, Віцебшчыну, Магілеўшчыну, або ўласную, па старой тэрміналёгіі, Беларусь, яна далучыла да Маскоўшчыны. Вядома, што гэта было зроблена ў астатні, так сказаць, дзень і навет супроць запраўднай волі беларускіх бальшавіцкіх зьездаў і супроць адкрытага жаданьня беларускіх камуністаў, але невядома: нашто так было зроблена?

Ці гэтым узаканялася старая русіфікатарская работа?

Ці гэтым клалі палітычную мяжу для варожых наступленьняў з Захаду?

Ці што яшчэ?

Трудна сказаць, што мелі на думцы маскоўскія камуністы. Толькі рэзультат ёсьць для іх самы неспадзяваны: беларускі рух у далучанай часьціне Беларусі за кароткі час чыста-формальнага, так сказаць, далучэньня яе да Маскоўшчыны, нязвычайна ўзрос. Фактычна ад а тў далучэньня нічога ў гаспадарсьцьвенай маскоўскай рабоце не зьмянілася. Няма там гвалтоўнай дэнацыяналізацыі, як у другіх кутох Беларусі, значыцца, дзеяньне ня выклікае супроць-дзеяньня, але годзе было аднаго пустога акту, каб з усіх бакоў ад несьвядомых раней беларусаў пасыпаліся пастановы аб патрэбе беларусізацыі школы, суда, адміністрацыі і інш., каб пачалі расьці там сьвядомыя працаўнікі ў адраджэньні, як грыбы апасьля дожджу. Дайшло да таго, што навет некаторыя самыя ўсходнія, самыя абмаскаленыя паветы, праз свае рады, выказуюць жаданьне адлучыцца ад Маскоўшчыны і далучыцца да невялічкага савецкага асяродку Беларусі!

А загадка астаецца загадкай.

Дзейкалі, што пры другім абвешчаньні незалежнай савецкай Беларусі, улетку 1920 г., адбудзецца аб‘яднаньне ўсходняй Беларусі з Менскам. Дагэтуль яшчэ нічога ня чуваць.

Значыцца, маскоўскія камуністы яшчэ не зразумелі да канца свае абмылкі ў беларускім пытаньні?

Загадка астаецца загадкай.,.

Дзед Кузьма.

Самазванцы.

„Прадстауніцтвы“ і „урады“.

Пад той час, як усю зямлю Беларускую, пабітую на часткі рознымі окупацыямі, топтавалі чужацкія войскі, а праваможны ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі прымушаны быў шукаць прыпынку ў прыязных для нас чужых дзяржавах (Лацьвіі, Ліцьве, Украіне, Францыі, Нямеччыне, Чэхах і т. д.),—на целе беларускага народу вырасталі паганыя, ядавітыя грыбы. Гэта — чысьленыя самазванныя „прадстаўніцтвы“ Беларусі, беларускія „ўрады“ і т. п., каторыя, маючы на мэце адно толькі „паспэкуляваць“ на беларускай справе і набіць сабе кішэні грашмі розных ворагаў Беларусі, паганілі імя беларускае і абніжалі павагу запраўдкага беларускага дзяржаўнага прадстаўніцтва.

Беларускі барон.

Пачнем з Украіны. З благаслаўленьня ліхой памяці гэтмана Скорападзкага—напярэдадні яго палітычнае сьмерці—згуртавалася ў Кіеве цэлая грамада беларускіх паноў-абшарнікаў з Магілеўшчыны з баронам Розэнам на чале. Гэтая група, разам з гэтманам Скорападзкім, манілася далучыць да Украіны тую часьць Беларусі, якая аставалася на ўсходзе ад лініі Берасьцейскага міру. Быў намечаны ў гэтмана ўжо і „намесьнік“

42088

для Беларусі—бяздарны, пусты генарал Дашкевіч-Гарбацкі.

Украінскі народ выгнаў вон Скорападзкага, а разам з тым разьбіліся і ўсе пляны магілеўскіх паноў, памыкаўшыхся „спэкульнуць“ на беларушчыне.

Пан Бахановіч.

Пад націскам бальшавікоў на Кіеў, дзе пры Скорападзскім была сабралася ўся расейская рэакцыя, гэныя чорныя крукі пачалі ўцякаць у Адэсу. І тут на рубяжы 1918—19 г. г. мы бачым новую спробу спэкуляцыі на беларусах. Гэтым разам папрабаваў шчасьця нейкі авантурнік Бахановіч (з Горадзеншчыны), быўшы некалі афіцэрам у расейскай арміі. Бахановіч гадоў дваццаць бадзяўся па Расеі, калі-ж узьнялася бальшавіцкая рэвалюцыя, ён завёў нейкія падазрыцельныя адносіны з немцамі і пры іх помачы прыяжджаў з Пецярбургу на Беларусь. Не знайшоўшы тут грунту для сваей спэкуляцыі, ён перакінуўся ў Кіеў і з усей маскоўскай чорнай сотняй перасяліўся адтуль ў Адэсу. Карыстаючыся з таго, што з Бацькаўшчынай ня было ніякае сувязі, Бахановіч заявіў тамтэйшым беларускім арганізацыям, быццам у Менску Рада Рэспублікі і Урад разагнаны немцамі, а затое ў Слоніме адбыўся новы „ўсебеларускі конгрэс“, каторы выбраў „дырэкторыю“ з пяцёх асоб, за галаву яе назначыўшы яго, Бахановіча. Ня гледзячы на паказаньне „нотарыяльных“ копій пастаноў „Конгрэсу“, ніколі ня быўшага, прадстаўнікі ураду Бел. Нар. Рэспублікі зразу „раскусілі“ самазванца і раскрылі яго карты перад француcкай галоўнай камандай у Адэсе, да каторай Бахановіч зьвярнуўся па пропуск у Парыж на міравую конфэрэнцыю. Адначасна Бахановіч зьвязаўся з генаралам Дэнікіным, абвесьціў ад імя Беларусі прылучэньне яе назад да Расеі, атрымаў некалькі сот рублёў „задатку“ за прадажу Беларусі і меўся атрымаць некалькі мільёнаў „на арганізацыю беларускай арміі“, каб, маючы пропуск у Парыж, з гэтымі грашмі пусьціцца на вольны сьвет. Генарал Дэнікін, вераты Бахановічу, паслаў яму прывітальную тэлеграму, выказваючы сваю радасьць з прычыны павароту беларусаў пад „Матушку Расею“! — Але адэскія беларусы папсавалі ўсе пляны Бахановіча: французы яго арыштавалі, як звычайнага ашуканца, і выпусьцілі толькі ўзяўшы падпіску, што пакіне распачатую авантуру. Дэнікін таксама адрокся ад яго і грошы ня даў.

Так скончылася і другая спроба спэкуляцыі на беларусах, і толькі зрэдка даходзяць глухія весткі, што ў Празе Бахановіч „працуе“ ў расейска-чарнасоценскай хаўрузіі, як „прадстаўнік“ Беларусі, здаволіваючыся дробнымі міласьцінамі...

Пан Цьвірка-Гадыцкі.

Адначасна з тым, як Бахановіч абвяшчаў у Адэсе ніколі ня быўшы „слонімскі конгрэс“, — у Горадні (ў пачатку 1919 году) ў газэтах зьявілася нейкая дзіўная тэлеграма, быццам у Навагрудку адбыўся „другі ўсебеларускі зьезд“ з учасьцем сябраў Рады Рэспублікі, літоўскай Тарыбы і да т. п., каторы таксама абабраў новы „ўрад“ Беларусі. З прычыны таго, што Навагрудак пад той час быў ужо заняты бальшавікамі і што нікому з беларускіх дзеячоў, быўшых тады ў Горадні, а таксама і членам Тарыбы нічога аб падобным зьезьдзе ня было вядома, ўсе беларусы лічылі гэну вестку звычайнай газэтнай „качкай“. Аднак, аказалася, што вестку гэту пусьціў новы „пратандэнт“ на беларускую ўладу і на... польскія грошы! Гэта быў дробны панок з Меншчыны, Цьвірка-Гадыцкі, каторы, разам з нейкім палкоўнікам Янсэнам, быццам-то ад імя „конгрэсу“ абвесьціў далучэньне Беларусі да Польшчы! Прадстаўнікі „новае ўлады“ адбылі навет падарожу ў Варшаву, дзе былі прыняты прадстаўнікамі польскага ўраду. Але, варочаючыся ў Горадню, Цьвірка-Гадыцкі сустрэўся з вялікай прыкрасьцю: ён быў арыштаваны літоўскай уладай і каля году прасядзеў у Ковенскім вастрозе, дзе зусім забыўся аб сваіх вялікіх плянах і ўдаваў дуркога...

Цікава адзначыць, што два апошнія самазванцы йшлі зусім тэй самай дарогай: абодва абвяшчалі сябе выбранцамі неістнаваўшага другога ўсебеларускага зьезду, навет памяшчаючы яго ў суседніх мясцох:—Слоніме і Навагрудку! Спосаб нявыдумны.

Пан Аляксюк.

Канец 1919 году прынёс сумнае здарэньне: разлад у Радзе Рэспублікі. Прайшло шмат часу, пакуль зробленую гэтым беларускай дзяржаўнай справе школу ўдалося паправавіць. Але цяпер гэты разлад ужо можна лічыць аканчальна зьліквідованым. Дык-жа ізноў паяўляюцца новыя самазванцы. Гэтым разам працуе скомпрометованы ў вачох беларускага грамадзянства Аляксюк, а памагае Балаховіч. Утвораны ў Варшаве „Беларускі Палітычны Камітэт“ з морально блізкіх Аляксюку «дзеячоў» разам з Балаховічам абвяшчае сябе адзінай «законнай» уладай Беларусі.

Адна цана.

Ведама, і аляксюкоўская авантура мае такую-ж цану, як авантура Розэна. Бахановіча, Цьвіркі-Гадыцкага. І мы-бы так доўга не затрымліваліся на ўсіх тых самазванных «урадах» беларускіх, каб не адна акалічнасьць: беларуская справа гэтак вырасла, рэалізацыя беларускае дзяржаўнасьці гэтак блізка,—што розныя амбітныя, ахвочыя лёгка здабыць і славу і грошы людзі, пачынаюць завіхацца каля захвату ўлады ў будучай незалежнай Беларусі.

Ды ўсё гэта — дарма. Самазванцы шыбка выяўляюць сваё аблічча, і народ на іх ніякае ўвагі не зварачае. Іменьні іх будуць запісаныя толькі на „чорнай дошцы“..

Г. Б.

МАЎЧЫ...

Маўчы, мой браце, хай другія
Гавораць сьвету аб табе, —
Табе нічога непатрэбна,
Ты сьпі, замкнуўшыся ў сабе.

Так, так маўчы, ня выпадае
Пра скарб свой думаць, аб дабры,
Хай за яго спускаюць пену
У кроў ліюць твае „сябры“.

Маўчы... Ня чуеш ты, што цела
Тваё чвартуюць папалам
Што ім таргуюць так адкрыта, —
Так, так, маўчы, мой браце, сам.

На што? то-ж ты зусім ня бачыш,
Што ўвесь твой у руінах край,
Што ўсё папалена, пабіта.
Маўчы, маўчы, мой гаратай.

Ня бачыш, браце, ты й ня чуеш,
Як над табой зьвіняць мячы,
Дабро зьнішчаецца і гіне, —
Так, так, мой браце, сьпі, маўчы...

Ігнат Дварчанін.

* * *

Сьветлы дзень дагараець над сумнай зямлёю,
Клёнаў макаўкі фарбай гараць залатою,
Сад пажоўклы цямнее, маўчыць. —
Каля яблынак цені ляглі галубыя,
Пацямнелі высокія ліпы густыя.
Скора ясны заход дагарыць...
Ажываюць нячутна жаданьні
У гэты час, час маўклівы зьмярканьня.
Я хачу пазабыць на мінутку аб горы
І глядзець, як у рожавым захада моры
Косы бледнага сонца сплялісь...
Я памерці хачу вось такою парою,
Хваляй сонца залітая ўся залатою,
Каб і слоў тых ня чуць: „прабудзісь“...
Ажываюць нячутна жаданьні
У гэты час, час маўклівы зьмярканьня.
Я хачу ў гэты момант пазнаць сваю долю,
Я хачу ведаць шчасьце, хачу я на волю,
У далі родных, шырокіх палёў!
Я хачу... я хачу... не хапае мне сілы,
Каб ня думаць аб тым, няпрыхільным нямілым,
Сумным жыцьці апошніх гадоў.
Ажываюць нячутна жаданьні
У гэты час, час маўклівы зьмярканьня.
Сад маўчыць, не пяець як раней, як вясною.
Аб тым шчасьці, што некалі жыла са мною,
Сад пажоўклы і цёмны стаіць...
Каля яблынак цені ляглі галубыя,
Пацямнелі высокія ліпы густыя,
Скора ясны заход дагарыць...
Засынаюць нячутна жаданьні
У гэты час, час маўклівы зьмярканьня.

Натальля Арсеньнева.

1920 г.

Ноч.

Ня бойся, што хмараю цёмнай
Так доўга вішу над зямлёй,
Што ў лесе хваёвым так сумна,
Як ў долі гаротнай тваёй.
Ня вечна ж і цемрай і жахам
Я буду цябе абнімаць;
Ня вечна і сьцюжай, і страхам
Я буду зямлю спавіваць.
Як прыдзе вясна чараўніца,
Як скіне мой чорны убор,
І збудзіцца маці-зямліца,
Адклікнецца голасна бор,—
Узьдзену я новыя шаты
З празрыстых праменьняў вясны,
І пояс зялёны, багаты,
І золак, і зоркі, і сны...
І з ціхім і лёгкім ўздыханьнем,
Я буду па траўцы ступаць;
І негія словы каханьня
На сьпячых людзей навяваць.
Калі-ж не дажджэш і загінеш,
І скрыешся ў чорнай зямлі,
А жаль і нуду тут пакінеш,
Каб скардзіцца вечна маглі,—
Я ў цьме, няпрыметнай рукою,
І жаль, і нуду ўсю зьбяру,
І раніцай з зор грамадою
Да Бога, у неба зьнясу.

Ганна Душэўская

1920.
Вільня.

БЕЛАРУСЫ-БЕЖАНЦЫ НА УКРАІНЕ.

БАБУСЯ.

(З натуры).

Восенны дзень адходзіў на спачынак пачынаўся вечар. Неба, — як гэта часта бывае ў восенную пору,—зацягнута было сізымі калматымі хмарамі; з поўначы дуў халодны, войстры вецер.

Я ішоў па вуліцы аднаго ўкраінскага мястэчка. Насустрэч мне паўзла, апіраючыся на сукаваты кій, старэнькая, убогая кабета. Яна апранута была ў нейкае запэцканае брудам шкумацьце, ад каторага цягнуліся па ветру, як павучыньне, выпацканыя ніткі. Ногі яе, замест башмакоў, былі акручаны каравымі анучамі і абмотаны войлакам, голаў яе пакрывала брудная хвустачка, больш падобная да анучы, якою добрыя гаспадыні дастаюць гаршкі з печы, чым да жаноцкага ўбору. Гледзячы на ўбогую кабету, здавалася, што гэта не чалавек ідзе, а паўзе нейкае калматае страшыдла, якое выпусьцілі на вуліцу, каб пужаць людзей.

Праз дзіры і распоркі лахманоў вецер, ня маючы перашкоды, бяз усякага жалю рэзаў худое, жоўтае цела бабулькі, і яна ад сьцюжы дрыжэла, як асінавы ліст у непагоду. Сівая, як хваёвы мох, галава бабусі, твар у зморшчынах, выпучаны паміж лапатак на сьпіне горб з добры бохан, запаўшыя глыбака пад лоб вочы,—усе гэтыя дары жыцьця сьведчылі, што ўладарка іх надта многа гадоў ужо працавала і на працягу свайго жыцьця бачыла бяды ды смутку.

Параўняўшыся са мною, кабета глянула ў мой бок сваймі падсьлепаватымі вачыма і, схіліўшы голаў, пакорліва сказала:

— Пахвалёны, паночку.

— Навекі,—адказаў я. Па яе прывітаньні я дагадаўся, што жанчына гэта мусіць быць з нашае старонкі, з Беларусі роднай; і каб зусім упэўніцца ў гэтым, папытаўся:

— Скуль ты, бабуська?

— З Горадзеншчыны, паночку, з пад самага Ваўкавыску,—адказала яна.

— Як-жа ты сюды папала?

— А гэтак, паночку: упіхнулі мяне ў Баранавічах у вагон дый прывязьлі ў Харкаў, а стуль прыгналі сюды да мястэчка. Казалі, што тутака будзе добра жыць.

— Што-ж, не ашукалі? дапытваўся я.

— Гдзе-ж там, — скардзілася старая,—якое нам тут жыцьцё. Пойдзеш жабраваць і нічагусенькі не дастанеш,—заўсёды з пустою торбаю прыходзіцца варочацца дамоў. Ужо другі дзень і расіначкі ў роце ня было. Хоць памірай з голаду,—жалілася кабета.

— А чаго было, бабуська, забівацца ў чужы край; ці-ж ня лепей было-б астацца на бацькаўшчыне і там чакаць сьмерці,—сказаў я.

— Ай, паночку, хіба мы па сваёй ахвоце выйшлі з бацькаўшчыны; нас сілком з хат павыпіралі. На Спаса прыскакалі да нас казакі, падпалілі вёску і давай бізунамі нас гнаць у Расею... Ось паглядзі, паночку, які мне гасьцінец гіплі на памяць пакінулі. — І бабуся, раскрыўшы сваё рызьзё паказала на целе шнур ад нагайкі.

— Дык ось якімі ласункамі нас з бацькаўшчыны сюды зманулі,—дакончыла старая сваю са мной размову і пацягнулася далей, бразкаючы сваім кіем па бруку.

— Куды-ж ты, бабуська, сьпяшаешся?—папытаўся я ўжо ўздагон.

— А пайду ў цэркаўку ды памалюся Божухну, каб барджэй сьмертухну за мной прыслаў: мо' на тым сьвеце будзе лепш,—кінула мне старая ў адказ, адходзячы.

Мо' праз гадзіну якую або трошкі больш, я варочаўся дамоў тэй самай вуліцаю, на якой сустрэў, ідучы ў мястэчка, бабусю-бяглячку. Недалёчка ад таго месца, гдзе мы з старою размаўлялі, я ўгледзіў гурток людзей, якія стаялі паўкругам ля самага раўчака, што йшоў з краю вуліцы. Хоць ужо пачынала цямнець, але яшчэ добрыя вочы дасканальна маглі разгледзіць абрысы людзей і па іх тварах дагадацца, што яны нечым устрывожаны, перабіваюць адзін аднаго і, ківаючы галавамі, паказваюць пальцамі на нешта калматае, што ляжала ўздоўж раўчака. Па усім было відаць, што тут здарылася нешта. Падходжу і я да гуртка і праз жывую сьцяну людзей ледзь-ледзь прабіваюся да раўчака; пачынаю разглядаць ляжачае шкумацьце і... Божа мой! што я бачу: у брудзе ляжыць бабуся-бяглячка! Моцна сьціснутыя губы і векі, скамянелы твар, выцягнутыя ўздоўж цела рукі сьведчылі, што жыцьце ўжо пакінула яе.

— Такі яе лёс, — сказаў нехта з чарады.

— Мусіць памерла з голаду,— адазваўся другі.

— Ішла бабка з царквы, — пачала расказваць адна дзяўчына, — пасьлізнулася, бабухнула ў раўчак і адразу Богу душу аддала. Даль-бо, праўда: ўсё сама сваімі вачыма бачыла.

Паміж гуртка пайшлі перасуды ды спрэчкі як, што і адчаго здарылася з бабусяю-бяглячкаю гэтакая цяжкая прыгода.

А бабуся ляжала выцягнуўшыся ў раўчаку, і труп яе паказваўся цяцер даўгім, даўгім; сьмерць выцягнула яе, быццам хацела зраўняць з другімі, каб хоць па сьмерці яна не асталася ў крыўдзе і займала столькі месца, колькі займаюць другія.

Падыйшлі два паліцэйскіх з цясакамі пры баку і з кнігамі запісаў пад пахамі. За імі зараз пад'ехала калымага, запрэжаная дрэнным, аблезлым канём. Палажылі труп бабусі на воз і павязьлі ў паліцыю на дазнаньне. Праз хвіліну-другую ад'яжджаючая калымага шчэзла ў цямноце, людзі моўчкі разыйшліся, і на вуліцы ўсё сьціхла; толькі негдзе далёка, далёка, у цемры ночы, нехта голасам поўным жалю і нуды, пяяў:

Адным-адна яна жыла
Ускрай чужога поля;
На гасьцінцы, упаўшы, памярла,
Цяжка яе доля.

Як хавалі, плахтай чыстай
Воч ёй не закрылі;
Бяз пацераў прад Прачыстай
У дол апусьцілі.

Ідучы дамоў, я доўга думаў аб бабусі-бяглячцы і, здавалася мне, што ў сьмерці яе павінна ўсё мястэчка, усе тыя людзі, што так пільна рупяцца толькі аб самых сабе.

Кандрат Лейка.

Кліч прабуды.

Песьняры-Званары! Вы ударце у звон і народ свой са сну вы збудзіце!

Спаў, бяздольны, спаў доўга... Хай устане ўжо ды падымецца, хай узгляне на сьвет ды падзівіцца: ясны дзень увакруг...

То ня зоркі стыдлівыя, нясьмелыя,— то пагоднае сонца ўжо высока гарыць! Да работы пара! Ніва жджэць, плуг гатоў... Да работы-ж завіце народ!

Спаў народ; дзірваном яго ніва ляжала... А кругом—у другіх—ужо кіпела сяўба ды жніво. З нашай нівы зьбіралі ў чужое гумно, і сваім гэны збор называлі... На руку быў суседзям наш сон непрабудны,—і да сну яны нас калыхалі...

Спаў народ, але лепшыя сыны ягоныя ўпару яшчэ вышлі на бацькаўскую ніву і як можна было, баранілі яе. Ой, ня лёгка-ж ім—адным, гаратным,—родных меж пільнаваць спазаранку... Ой! ня лёгка-ж ім—маладым, нядужым,—родны дом будаваць бяз устанку!...

Хто ім друг, стаў пры іх! Ніва жджэць!... плуг гатоў... Выхадзі, аратай! Выхадзі ты хутчэй! Узьнімай дзірван на ніве сваей!...

* * *

Песьняры-Званары! Вы ударце ў звон і народ свой на ніву вядзіце!

Хай згіне зьдзек і засільле з вобліку нашае зямелькі; хай ня кажа ніхто, што і ў нас—як ўсюды—дужэйшы над слабейшым глуміцца.

* * *

Песьняры-Званары! Вы ударце ў звон і пацешце народ у нядолі!

Не бяда, што ён спаў! Ен у сьне новых сіл набіраў, каб устаўшы за двух працаваці...

Не бяда, што ўжо сонца высока! Дзень даўгі... Для нас сонца зайдзець няскора!...

Не бяда, што ворагаў многа! Іхны дзень да канца ўжо падходзіць. Заварушыліся... загаманілі: чуюць сьмерць!...

А асілак-народ, шаг за шагам ўпярод, пачынае крышыць перашкоды...

* * *

Песьняры-Званары! Дык-жа бійце ў звон, але так, каб чувалася ўсюды:

Час прабуды настаў; аджыла Беларусь і—жыць будзе!

Пётра Прооты.

Вільня.
6. І. 1921.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Чацьвер, 6-га студня 1921 *г.*

Расея і Эстовія. Дыплёматычным прадстаўніком Савецкае Расеі і старшынёю дэлегацыі ў Рэўлі назначан Ліцьвінаў. Гукоўскі, які дагэтуль займаў тую пасаду, дастаў новае назначэньне.

Амэрыка. Цяжка захварэу прэзыдэнт Вільсон.

Землятрасеньне. У паўдзённай Амэрыцы страшэнным землятрасеньнем надоячы забіта і ранена 7.000 чалавек.

Пятніца, 7-га студня 1921 *г.*

Польшча. Разьвязаньне кабінэтнага крызіса адкладаецца.

Расея. У зьвязку з замірэньнем на ўсіх фронтах чырвонаармейцаў патроху ўжо дэмобілізуюць, даючы ім бяссрочныя водпускі.

Сярод белых. У арміі Врангеля, якая цяпер на Гальліполі, пануе пошасьць тыфусу.. Чакаюць бунта арміі.

Індыя. Кангрэс індыйскіх нацыяналістаў ў Рэігпуры прыняў рэзолюцыю спачуцьця да ўчынку памершага ад голаду у турме ірляндзкага дзеяча Мак Сьвінэя і да ірляндзкага народа ў яго змаганьні за незалежнасьць. Кангрэс пастанавіў байкатаваць ангельскага прынца Коннауцкага, які мае прыехаць у Індыю.

Лацьвія. У Рызе забаставалі чыноўнікі мястовых устаноў, вымагаючы, каб ім далі дабаўку ўроўні з гаспадарсьцьвеным чыноўнікамі. Мястовая рада адмовіла; яе ўстановы заняты войскамі.

Субота, 8-га студня 1921 *г.*

Вільня. Выбары ў Віленскі Сойм назначаны на 6 лютага.

Ліга Народаў пасьля ноты Чычэрына адмовілася пасылаць у Вільню міжнароднае войска.

Польшча. Адстаўка міністра Дашынскага прынята.

Белыя і чорныя. У Бэрліне утварыўся новы цэнтр расейскай рэакцыі, так званы „Камінэт чатырох дум". Грошы на яго дае Нямеччына і Амэрыка

Украіна. Весткі аб растрэле б. ўкраінскага старшыні міністраў С. Галубовіча падцьвярждаюцца.

Прадстаўнік Савецкай Украіны на перагаворах у Рызе Шумскі катэгарычна патрэбаваў ад Іоффэ, каб мірны трактат і ўсе дапаўняючыя ўмовы ўкладаліся ў трох экземплярах, г. ё. каб Украіну ўважалі за незалежнае гаспадарства. Пасьля надта даўгіх спрэчак Іоффэ згодзіўся на гэта.

Румынія. Кароль падпісаў дэкрэт аб мобілізацыі.

Нядзеля, 9 студня 1921 *г.*

Грэцыя. Выбухнула рэволюцыя. Кароль Канстантын ухаваўся у сваім замку ля Афін. Замак абкружаны ўзбунтаваным войскам.

Амэрыка. З Нью-Іорка паведамляюць, што прынята асыгноўка 3¼ міліёнаў даляраў на помач старонкам, пацярпеўшым ад вайны; Расеі—1 міл. дол. Польшчы—690.000 м. д., Ліцьве—75.000 м. д. і інш.

Турцыя. У Канстантынопалі начала выхадзіць камуністычная газэта.

Украіна. Зноў паведамляюць, што паўстаньне пашыраецца.

Расея. Амэрыканскія жыдоўскія газэты пішуць, што ў Маскве бальшавікі растрэлілі вядомага жыдоўскага капіталіста і грамадзкага дзеяча Персіца.

Панядзелак, 10-га студня 1921 *г.*

Нямеччына. У Дрэздэнэ, Лейпцыгу і Хемніцу вялізазныя маніфэстацыі. Шмат дзе забастоўкі.

Аўторак, 11 *студня* 1921 *г.*

Англія. Парыж, 7 студня (П. А. Т) Безработнасьць у Лёндыне павялічываецца з кожным днём, ня глядзячы на заходы ўраду. Супроць-урадовая агітацыя сярод работнікаў таксама расьце.

Францыя. Чакаюць зьмены некалькіх міністраў.

Грэцыя. На вуліцы забілі б. старшыню грэцкага трыбунала.

Бесарабія. Румыны распачалі энэргічнае змаганьне з бальшавіцкай прапагандай.

Польшча. З Калішa паведамляюць, што здарылася катастрофа на зялезнай дарозе. Ранена 14 чалавек.

Аўстрыя. Вена, 3. 1. (Орыент). Левая соцыялістычная работніцкая партыя, каторая выступіла з аўстрыяцкай партыі, вядзе цяпер, як паведамляе Роста. перагаворы з камуністамі і парашылася на прыступленьне да III інтэрнацыяналу разам з імі.

Серада, 12-га студня 1921 *г.*

Армія Врангеля. Вена, 8 студня (Ор.). З Лёндына паведамляюць: па прыбыцьці войск ген. Врангеля ў Гаяіполі выбухнуў агульны бунт. Ангельскія, францускія і расейскія афіцэры забіты бунтаўнікамі. Дэзорганізаваная і дэмаралізаваная армія рабуець старонку і йдзець на Канстантынопаль. Адна банда з 2.000 салдат рушыла на Радосту. Становішча сур'ёзна, бо і войскі, што знаходзяцца ў лагерах наўкол Канстантынопаля, збунтаваліся супроць коаліцыі.

Англія. Пачалася зьмена міністраў. Першы папрасіўся ў адставку міністр Мільнер.

Англія і Германія. Дэ-Валера вымагае ад ангельцаў прызнаньня незалежнасьці Ірляндыі, бо іншай магчымасьці дайці да згоды ён ня бачыць.

Англія і Расея. Перагаворы між ангельскім урадам і савецкімі дэлегатамі ў Лёндыне прывялі да згоды.

Украіна. Газэта „Рідный Край" паведамляе, што Кіеў аблягли 17 тысяч украінскіх паўстанцаў.

Польшча. Камэндант Пілсудзкі паедзе ва Францыю ў канцы гэтага месяца.

Венгрыя і Аўстрыя. Венгрыя сабрала на аўстрыйскай граніцы 35 тысяч войска, бо рыхтуецца ваяваць з ёю за свае заходнія краіны.

Італія і Юга-Славія. Бэрлін, 8 студня. На востраве Арбэ высадзіліся нерэгулярныя войскі Юга-Славіі, вестка аб чым выклікала страшэннае абурэньне ў сталіцы Італіі Рыме.

Рэвалюцыя у Ірляндыі.

Змаганьне ірляндцаў за незалежнасьць.

Віцэ-прэзыдэнт Ірляндзкай рэспублікі пастар О'Флянаган паслаў перад сьвятамі ноту да Лойд-Джорджа, ў якой гаворыць, што сінфэйністы зьяўляюцца сусьветнаю палітычнаю арганізацыяй. Каб дайсьці да паразуменьня, дык трэба заключыць мір, а пасьля міру шукаць згоды. Ангельскі ўрад павінен спыніць рэпрэсыі проці ірляндцаў і шанаваць іх конституцыйныя свабоды. Дарогі і спосабы, магчымыя для прыняцьця абедзьвюма старанамі, павінны устанавіць упоўнаважаныя прадстаўнікі абодвух краёў. Пакуль ангельскі ўрад гэтага ня выпаўніць, датуль ня можа быць мовы аб паразуменьні.

Прэзыдэнт дэ-Валера.

НЬЮ-ІОРК, 1 студня. Рэволюцыя ў Ірляндыі ня сьціхае. Сінфейнэры вядуць крывавыя бойкі з ангельскім войскам. З Амэрыкі вярнуўся ў Ірляндыю прэзыдэнт Ірляндзкай рэспублікі дэ-Валера. хоць ангельскія ўлады вартавалі на ўсіх прыстанях, каб злавіць яго. Цяпер спадзяюцца з боку ірляндзкіх незалежнікаў яшчэ вайстрэйшага змаганьня.

Голас ангельскіх работнікаў

ЛЕНДЫН, 3 студня (Ор.). Ангельская партыя працы прыняла

Аб урадах на Беларусі і урадзе Беларускае Народнае Рэспублікі.

У № 1 „Нашае Думкі" за 1921 год, у заметцы „Колькі цяпер урадаў у беларускага народа?" перанятай з „Новага Варшаўскага Слова" і папраўленай водле запраўднасьці, мы дайшлі страшэнай цыфры 10...

Апрача адзінага законнага ўраду Беларускае Народнае Рэспублікі і камуністычнага ўраду Савецкае Беларусі, мы налічылі яшчэ шмат чужацкіх ўрадаў, да якіх адышлі сумежныя часткі падзеленай Беларусі. Памянулі мы таксама і адзін самазванны ўрад, так званы Беларускі Палітычны Камітэт, бо ён яшчэ толькі паўстаў і не пасьпеў зламаць сабе авантурніцкай шыі, як падобныя да яго папярэднікі (гл. артык „Самазванцы").

Страшэнная цыфра 10! Яна робіць вялікую прыемнасьць ворагам беларускага народа, як гэта бачым з іхных і падкупленых імі газэт. Яна робіць вялікі смутак тым маладушным беларускім грамадзянам, якім здаецца, што бацькаўшчына падзелена ўжо навекі, а яе законны ўрад гдзесьці загінуў.

Але дарма цешацца з нашага ўпадку ліхія людзі і дарма сумуюць нашы маладушныя браты.

Дарма, бо навет тое становішча, якое цяпер маем, калі ў ім разгледзіцца, ня можа пацешыць ворагаў і засмуціць сваіх.

Чужацкія ўрады на кавалках Беларусі ня ёсьць ўрады беларускія,—гэта адно.

Яны не дасталі тут свайго панаваньня з рук законнага беларускага ўраду,— гэта другое.

І хоць-бы іх было ня пяць, а сто пяць,—адна ім цана.

Аб самазванных урадах няма што і казаць.

Астаюцца толькі два беларускія ўрады: законны ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі, на чале якога стаіць вядомы правадыр беларускіх соцыялістаў-рэвалюцыянераў Вацлаў Ластоўскі, і камуністычны ўрад Беларускае Савецкае Рэспублікі, на чале якога стаіць вядомы правадыр беларускіх камуністаў Аляксандар Чарвяк.

Значыцца маем якраз такое-ж палітычнае становішча, як украінскае, латышскае, літоўскае і навет польскае, дзе таксама відзім з аднаго боку народна-рэспубліканскія ўрады, зусім буржуазныя ці болей-меней блізкія да соцыялістычных, а з другога боку урады камуністычныя. Розьніца толькі тая, што камуністычны ўрад Лацьвіі сядзеў у Рызе, а камуністычныя ўрады Беларусі, які Украіны іцяпер сядзяць у самых асяродках сваіх старонак.

Праўда, ёсьць і яшчэ адна розьніца: тады, як іншыя з казаных камуністычных урадаў нікім ня прызнаны,—украінскі і беларускі камуністычныя ўрады так ці гэтак прызнаны Польшчаю праз мір з Расейскай Савецкай Федэрацыяй у Рызе.

Што ж з гэтага выцякае?

Але ад такога факта палітычнае значаньне і. першага з гэтых урадаў а ні каліўца не зьмяншаецца, а наадварот—таксама узрастае,

Кожны, хто прызнае Беларускую Незалежную Рэспубліку у прынцыпе, тым самым прызнае і яе ўрад, каторы мае законныя правы называцца урадам гэтае Рэспублікі.

А ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі пакуль што мае гэтыя правы, быць можа абніжаныя мірам у Рызе ў адносінах да усходняе Беларусі, але зусім не абніжаныя ў адносінах да Беларусі не-Савецкай.

Адхілімся для патрэб забыўчывых людзей троху назад... Найвышэйшай праявай ўсебаковаадраджэнцкай работы беларускіх мас была праца над будоўляй свайго незалежнага гаспадарства. Гэтая работа разьвярнулася у першыя ж дні рэвалюцыі у лютым 1917 году. У марцы у Менску адбыўся людны зьезд беларускіх грамадзкіх працаўнікоў, на якім быў заснаваны „Беларускі Нацыянальны Камітэт". Месца апошняга пасьля заняла „Цэнтральная Рада Беларускіх Арганізацый і Партый". За шэсьць месяцаў рэвалюцыі ідэя адраджэньня і палітычнага самавызначэньня Беларусі ўсё узмацоўвалася і разьвівалася на чысьленых зьездах, мітынгах і сходках. Пасьля трэцяе сэсыі „Цэнтральнае Рады Беларускіх Арганізацый і Партый" у кастрычніку 1917 года ясна выявілася патрэба стварыць дзяржаўнапраўную установу, якая узяла-бы у свае рукі уласьць, і палажыць асновы Беларускай Рэспублікі. Дзеля гэтага былі скліканы армейскія зьезды на ўсіх фронтах: заходнім у Менску (18-24 кастрычніка), паўночным у Віцебску (15-20 лістапада), румынскім у Адэсе (3-8 сьнежня), паўдзённа-заходнім у Кіеве; два зьезды беларусаў-бежанцаў у Маскве і адзін у Менску; зьезды вучыцялёў і розных грамадзкіх арганізацый у Смаленску, Віцебску, Полацку і іншых местах. Рэзультатам гэтых зьездаў было заснаваньне „Вялікай Беларускай рады" і „Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады", а такжа скліканьне Усебеларускага Зьезду з устаноўчымі функцыямі у Менску 18 сьнежня 1917 году (5-17 сьнежня стар. стыл.).

Усебеларускі Зьезд быў найбольш поўным і сур'ёзным выяўленьнем волі Беларускага народу, раўнуючы да такога-ж выяўленьня волі другімі нарсдамі быўшае Расеі. На зьезд прыехалі дэпутаты ад валасных (сялянскіх) земстваў, і камітэтаў з усяе этнографічнае Беларусі, ад павятовых і губэрскіх земстваў мястовых самаўпраўленьняў, работніцкіх арганізацый, ваенных з усіх фронтаў і тылу арміі, бежанскіх саюзаў і камітэтаў, коопэратываў, прафэсыянальных і іншых саюзаў Беларусі, усіх палітычных партый—разам 1167 дэпутатаў з правам пастанаўляючага голасу і 705—дарадчага. Зьезд, выяўляючы суверэнную волю Беларускага народу, пастановай 31 сьнежня 1917 году устанавіў рэспубліканскі дэмакратычны лад ў этнографічных межах Беларускае зямлі і выбраў найвышэйшую ўладу Беларусі: Раду Усебеларускага Зьезду.

Рада Першага Усебеларускага Зьезду — у ліку 54 асоб, папоўніўшы

на агульнай зборцы рэзолюцыю з вымаганьнем, каб Англія вывела з Ірляндыі свае войскі і дазволіла ірляндцам стварыць уласны сойм і констытуцыю пры супольных з Англіяй арміі і флоце.

Памяць мучальніка за незалежнасьць.

Удава бургамістра места Корк, замучанага ангельцамі у турме за ідэю адраджэньня Ірляндыі, ушанавана званьнем пачэснай грамадзянкі горада Нью-Іорка, чым паказана спачуцьцё амэрыканцаў Ірляндыі.

З Беларускага жыцьця.

Літва і Беларусь.

З Жэневы вярнуўся ў Коўню старшыня рады міністраў Беларускае Народнае Рэспублікі В. Ластоўскі. У справе плебісцыта ён бараніў перад Лігай Народаў мотывіроўку ні „за Польшчу“ ці *„за Літву і Беларусь“*. Міністр даводзіў, што пытаньне аб тэрыторыі між Літвой і Беларусьсю будзе палюбоўна разьвязана гэтымі двума брацкімі народамі без пастароньняе помачы.

Віленскія беларускія арганізацыі і пан Сямашка.

Віленскія беларускія арганізацыі, як тое ведама з пэўных крыніц, сваіх адносін да дзеяльнасьці цяперашняга беларускага міністра ў урадзе Літоўскай рэспублікі Дамініка Сямашкі не зьмянілі. Ня гледзячы на оптымізм беларускіх кругоў у літоўска-беларускіх пытаньнях, асоба Сямашкі дагэтуль выклікае ў іх благі настрой.

Пісьменьнік Піліпаў - Нялепка.

З Коўні паведамляюць, што беларускі пісьменьнік Піліпаў - Нялепка звольнен міністрам Сямашкай са службы ў Беларускім міністэрству.

Беларусы і „Беларускі Палітычны Камітэт“ пры Балаховічу.

Горадзенскі Беларускі Нацыянальны Камітэт прыняў рэзолюцыю, што ён ня мае нічога супольнага з беларускім палітычным камітэтам, створаным пры Балаховічу.

Слуцкія паўстанцы і Балаховіч.

У Вільню прыяжджаў на літэратуру адзін з дзеячоў слуцкага паўстаньня. Ен казаў, што балахоўцы надта стараліся узяць слуцкіх паўстанцаў пад сваю „апеку“, але тыя, ведаючы, з кім маюць справу, старанна адхіляліся ад няпрошанай дружбы.

Беларусь і Расея.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 4 студня (Ор.). Водле прынятых на зьезьдзе саветаў Беларусі рэзолюцый, Беларусь утварае складаную частку Расейскай Федэрацыі і ўсе яе спаўняючыя органы падчыняюцца адказным камісарыятам Расейскай Федэрацыі.

З Літоўскага жыцьця.

Літва супроць бальшавізма.

Рэвель, 6 студня. У Ліцьве намячаецца кірунак у бок супроць бальшавіцкай рэвалюцыі. Літоўскі урад заўважыў, што расейскія савецкія дэлегаты ў Коўні, асабліва Аксельрод, стараліся узварушыць рэвалюцыйны настрой; з свайго боку літоўскі прадстаўнік у Маскве пераверыўся, што расейскія саветы парываюцца «абальшавізіць» Літву.

Прыезд п. Вальдэмараса.

Вярнуўся ў Коўню з Жэневы прафэсар Вальдэмарас.

Опэра.

У Коўні адчынена опэра. На адкрыцьці была пастаўлена «Травіата» на літоўскай мове.

Школьны аддзел.

Цэнтральны фізычны кабінэт у Вільні.

Усе віленскія пачаткавыя школы, а таксама большасьць сярэдніх ня маюць у цяперашні час па прыродазнаўству і фізыцы ніякіх навуковых дапамогаў, апрача карцін. Практыковыя заняткі па фізыцы не вядуцца ні ў воднай вучэбнай установе. Гэткае ненормальнае становішча цягнецца ўжо сёмы год, ад 1915 г., і, такім чынам, цэлае школьнае пакаленьне не здабыла патрэбнае веды па фізыцы і прыродазнаўству, складаючым грунт адукацыі ўва ўсім сьвеце. Дзеля барацьбы з гэткім злом патрэбны неадкладныя мэры. На шкоду, з прычыны надзвычайнае дарагоўлі і недаступнасьці чужаземнае валюты няма ніякай магчымасьці абарудоваць зараз-жа патрэбнымі прыборамі і колекцыямі навет аднаго школьнага музэя, дзеля чаго на першы час трэба скарыстаць тыя фізычныя прыборы і колекцыі па прыродазнаўству, якія есьць у Вільні ў некаторых вучэбных установах, тым болей, што прыбор у школе дэмонструецца вучням усяго некалькі разоў у год, а рэшта часу ён стаіць ў шафе бяз ужытку. Гэтую акалічнасьць можна скарыстаць дзеля дэмонстраваньня свабоднага прыбору вучням іншых школ. Але-ж беспасрэдная перадача прыбору з аднэй школы ў другую, пры вялікай лічбе школ, выклікала-бы шмат перашкодаў на практыцы і, бязумоўна, вяла-б да папсуцьця прыбораў. Дзеля гэтага надта патрэбна арганізаваць Цэнтральны Фізычны Кабінэт (Ц.Ф.К.), які ў сваёй дзеяльнасьці павінен кіравацца гэткім прынцыпам: кожная школа захоўвае ў сябе свае колекцыі, але за вядомае вынагароджаньне пазычаець часова ў карыстаньне і на адпаведнасьць Ц.Ф.К. тыя з прыбораў, якія ёй у даны мамэнт непатрэбны. У памяшчэньні Ц. Ф. К. адбываюцца з пазычанымі прыборамі дасьледы (вопыты) для вучняў іншых школ, пры чым патрэбныя тлумачэньні вядуцца школьнымі вучыцелямі на мове выкладаньня ў тэй школе. Заведуючы Ц. Ф. К., ці яго лаборант толькі робяць дэмонстрацыі. Гэты Ц. Ф. К. павінен мець сваё ўласнае памяшчэньне: нязручна займаць яго пры якой-колечы школе, бо Ц. Ф. К. і школа будуць адзін-аднаго сьцясьняць; апрача таго, у часе пасяшчэньня Ц. Ф. К. вучнямі іншых школ, могуць вынікаць нежаданыя непаразуменьні. Зразумела, было-б пажадана замест фізычнага кабінэту арганізаваць адразу цэнтральны школьны музэй для абслугоўваньня патрэб ня толькі фізыкі, але і іншых навук прыродазнаўства. Аднак, фінансавая часьць справы вымагае паступовага разьвіцьця арганізацыі, прычым ў першы чарод трэба прыняць пад увагу інтарэсы фізыкі, пры выкладаньні якой нельга карыстацца навет карцінамі, як гэта часьцю магчыма пры выкладаньні батанікі, зоолёгіі, анатоміі. Дзеля эканоміі прыйдзецца разлажыць на некалькі гадоў пакупку патрэбных фізычных прыбораў і колекцыяў навет для Цэнтральнага Фізычнага Кабінэту.

Бліжэйшая дзеяльнасьць Ц. Ф. К. будзе складацца ў чародным:

1. Ц. Ф. К. высьвятляе колькасьць годных фізычных прыбораў і колекцыяў па прыродазнаўству ў розных школах м. Вільні і складае сьпіскі гэтых прыбораў.

2. Ц. Ф. К. падгатаўляе адпаведнае памяшчэньне з дзьвюма аўдыторыямі для сярэдняе і ніжэйшае школы, з лабараторыяй для практыковых заняткаў вучняў, а таксама з некалькімі дапамагальнымі пакоямі. З прычыны вялікае лічбы пачатковых школ, прыдзецца мець спэцыяльную аўдыторыю для іх, каб адначасова было-б магчыма рабіць дэманстрацыі і для сярэдніх і для ніжэйшых вучэбных установаў.

3. Ц. Ф. К. приступае да складаньня колекцыяў прасьцейшых прыбораў для практыковых заняткаў па фізыцы вучняў сярэдняе школы з такім разрахункам, каб гэтыя заняткі маглі пачацца з налецьця, будучага вучэбнага году. З аднымі і тымі-ж колекцыямі могуць працаваць у розныя дні і гадзіны вучні розных школ, дзеля чаго задачы павінны быць разьлічаны на дзьве гадзіны часу, гэта-ёсьць на адно пасяшчэньне Ц. Ф. К-ту. Па сканчэньні працы прыборы зараз-жа вычышчаюцца, зьбіраюцца і прыгатоўваюцца для новае групы вучняў.

4. Для дэмонстраваньня фізычных зьяваў вучням пачатковых школ Ц. Ф. К. спачатку ўжывае апараты сярэдняе школы, паступова выробляючы з падручных і танных матар'ялаў (шкла, дрэва, паперы і да т. п.), а таксама рэчаў хатняга ўжытку простыя і наглядныя фізычныя прыборы. Чым прасьцейшы прыбор, тым больш увагі зварачываюць дзеці на самае галоўнае ў дасьледзе (вопыце), г.-ё. разглядаемае фізычнае зьявішча, і ўрэшце запамятоўваецца і дасьлед і вывад з яго. Бліскучыя паліраваныя часьці складанага прыбору, розныя вінцікі, гаечкі і да т. п. кідаюцца перад усім у вочы дзіцяці, аб іх застаецца ўражаньне ў яго памяці, але-ж яны адцягваюць увагу ад галоўнага.

5. Ц. Ф. К. папраўляець, колькі гэта магчыма, зламаныя ці папсаваныя прыборы розных школ пры помачы тутэйшых майстраў (сталяроў, сьлесараў і г. д.). Разабраныя ці паламаныя часьці, прыбораў з розных школ, г. ё., прасьцей, фізычны лом, перадаюцца за плату Ц. Ф. К-ту для ужываньня яго на выпраўку іншых прыбораў, ці навет на вырабы новых.

6. Ц. Ф. К., даведаўшыся, якія колекцыі па прыродазнаўству і якія віленскія фабрыкі, майстэрні і іншыя ўстановы заслугоўваюць агляду, уваходзіць у зносіны з гэтымі ўстановамі аб парадку агляду іх асобнымі школамі. За тым, па згодзе з прадстаўнікамі школ, адбываецца паступовы агляд колекцыяў і устаноў вучнямі розных школ.

7. Пры Ц. Ф. К. адчыняецца бібліатэка з кніг на ўсіх тутэйшых мовах, а таксама на францускай, нямецкай, ангельскай з твораў па фізіцы і прыродазнаўству (унівэрсітэцкія курсы, асобныя монографіі, і да т. п.) Кнігамі з бібліатэкі могуць карыстацца і вучыцялі, і вучні старшых клясаў. Чытаньне кніг адбываецца ў чытальнай салі Ц. Ф. К., кнігі ў хату не выдаюцца. Першы час

свой склад прадстаўнікамі ад нацыянальных меншасьцяў краю выбрала Спаўняючы Камітэт і даручыла яму правадзіць у жыцьцё ўсе пастановы зьезду.

Спаўняючы Камітэт быў складзен з 17 асоб і вёў змаганьне, бароначы волю беларускага народу, на незалежнае дзяржаўнае жыцьцё, якая была выказана на зьезьдзе.

Калі пасьля Берасьцейскай умовы бальшавікі пакідалі Менск, Спаўняючы Камітэт арганізаваў збройную сілу, абвесьціў сябе вышэйшай уладай на Беларусі і выдзеліў з паміж сябе ўрад рэспублікі—Народны Сэкрэтарыят.

Народны Сэкрэтарыят (Рада Народных Міністраў) быў прызнаны ўсімі дэмократычнымі гарадзкімі і земскімі самаўрадамі, як вышэйшая дзяржаўная ўлада Беларускай Народнай Рэспублікі.

Такім парадкам, хаця і на нядоўгі час, была праведзена ў жыцьцё адна з самых глаўных пастаноў Першага Усебеларускага Зьезду. Не на даугі час дзеля того, што прыйшоўшая нямецкая акупацыйная ўлада спыніла працу Народнага Сэкрэтарыяту і не дала магчымасьці ўмацавацца беларускім дзяржаўным установам у правінцыі.

Лінія ваеннага фронту, якая устанавілася на усходзе у верасьні 1915 году, разьдзяліла Беларусь на дзьве часьці. Пры гэты у межах акупацыі апынулася уся Горадзеншчына, вялікшая часткі Віленшчыны і невялікі кавалачак Меншчыны.

25—26 студзеня 1918 году беларусам з вялікім трудам удалося склікаць у Вільні нацыянальную канфэрэнцыю, на якой былі прадстаўнікі акупіраванай у 1915 гаду часьці Беларусі (Віленшчыны, Горадзеншчыны і часьці Меншчыны). Канфэрэнцыя выказалася за адбудову незалежнай фэдэрацыйнай Беларуска-Літоўскай дзяржавы прызываючы да еднасьці і заакопную усходнюю Беларусь, аб долі і палажэньні каторай нямецкія уласьці не прапускалі у Вільню ніякіх вестак. Канфэрэнцыя выбрала также найвышэйшую беларускую нацыянальную установу для зямель старой нямецкай акупацыі—Беларускую Раду, каторай наказала супольна з літоўскім нацыянальным прадстаўніцтвам і нацыянальнымі меншасьцямі падгатаваць скліканьне установчага сойму.

Заняцьце нямецкім войскам Менску, дзе знаходзілася цэнтральная установа беларускай дзяржаўнай уласьці, прыняўшай пад той час імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, дало магчымасьць беларусам старой і новай акупацыі зыйсьціся разам і згаварыцца пасьля трохгадоваго перарыву усякіх зносін. У канцы марца 1918 году у Менск прыехала дэлегацыя Беларускае Рады з Вільні якая і прыняла учасьце у гістарычным паседжаньні Рады Рэспублікі 24—25 марца. Рэзультатам злучэньня прадстаўніцтва усходняй і заходняй Беларусі было апавешчаньне незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі яшчэ не адзін раз папаўнялася прадстаўнікамі ад розных дэмакратычных арганізацыяў і павятовых беларускіх рад.

У гэткім складзе Рада Б. Н. Р. бесьперастаньня змагалася за суверенныя правы беларускага народу на яго дзяржаўнае, незалежнае быцьцё.

Рада Б. Н. Р. увайшла ў зносіны з усімі дзяржавамі Эўропы і дамагалася ўчасьця на мірным кангрэсе ў Парыжы,

Перад прыходам у Менск бальшавікоў, Рада прымушана была распусьціць сябе на неазначаны час, даручыўшы вясьці ўсю далейштю працу Радзе Народных Міністраў.

З лістапада 1918 года пачала працаваць рада міністраў на чале з А. Луцкевічам.

У сьнежні (дзекабры) 1919 году ў Менску Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, замест старога кабінету А. Луцкевіча, выбрала новы на чале з Вацлавам Ластоўскім.

Праўда, у выбарах ураду В. Ластоўскага не прынімала учасьця больш-менш значная група сяброў Рады Рэспублікі, сабраная ў час выбараў у прыватным памяшчэньні вядомага беларускага дзеяча правага кірунку А. Уласава.

Гэтая група выказала веру старому беларускаму ураду А. Луцкевіча.

Такім чынам, у Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, рашчэпленай у сьнежні 1919 г. на дзьве часткі, зьявілася і два урады. Адзін—урад А. Луцкевіча, другі—В. Ластоўскага.

Аднак, гэта дваяўласьце цягнулася ня доўга.

Міністры кабінэту Луцкевіча, быўшыя за-граніцай, перайшлі у кабінэт Ластоўскага. Сам А. Луцкевіч пад той час аказаўся інтэрніраваны ў Варшаве, пакліка
ны туды старшынёю польскага ураду Падэрэўскім і быў бяссільны выехаць у Эўропу. Ен зрокся сваіх паўнамоцтваў, чым аканчальна разьвязаў пытаньне аб сваім кабінэце.

Гэты высока-шляхетны акт з боку А. Луцкевіча, памог беларускай справе і грамадзянству тым, што ізноў яны зрасьліся ў адно цэла, з адным кіруючым цэнтрам, якім і зьяўляецца ў сучасны мамэнт ўрад В. Ластоўскага, як урад Беларускае Народнае Рэспублікі.

Гэты урад мае ўсе фармальныя і іншыя правы лічыцца адзіным правамочным беларускім урадам,—бо ён выбран Радай Рэспублікі, у яго ўліліся прадстаўнікі быўшага кабінэту А. Луцкевіча, атрымаўшага паўторны мандат ад другой часткі Рады.

Пасьля ўсяго вышэй казанага пытаньне аб урадах на Беларусі і ўрадзе Беларускае Народнае Рэспублікі можа стацца спосабам газэтнага круцельства толькі ў самых наіўных нашых ворагаў і спосабам палітычнае авантуры толькі ў людзей моральна зусім паўшых або бязмозглых.

А. Мсьціслаўскі.

ібліатэка складаецца з кніг, дадзеных у часовае карыстаньне і на пераховы Ц. Ф. К-ту рознымі гурткамі, школамі, вучыцялямі і прыватнымі асобамі. Дапаўняецца бібліатэка паступова спосабам купляньня кніг. Апрача таго, Ц. Ф. К. зьбірае ведамасьці аб навуковых кнігах па фізыцы і прыродазнаўству, якія знаходзяцца ў розных вучэбных установах, гуртках, у вучыцялёў і прыватных асоб. Са згоды ўласьнікаў гэтым кнігам вядзецца асобны каталёг. У выпадку патрэбнасьці гэткае кнігі з боку чытаньнікаў, Ц. Ф. К. часова пазычае гэтую кнігу ад уласьніка на сваю адпаведнасьць і выдаець яе для чытаньня ў памяшчэньні Ц. Ф. К., але ня ў хату. Калі пяройдзе патрэбнасьць, кніга аддаецца ўласьніку.

8. З бегам часу дзеяльнасьць Ц. Ф. К. пашыраецца паступова і на іншыя часьці прыродазнаўства—ботаніку, зоолёгію, анатомію і г. д.

9. Ц. Ф. К. служыць месцам аб'яднеyньня віленскіх вучыцялёў фізыкі і прыродазнаўства і дапамагае пэдагогічнай працы гэтых вучыцялёў. У Ц. Ф. К. з часам можа быць зроблена і лабараторыя для заняткаў вучыцялёў. Апрача таго, пры Ц. Ф. К. могуць арганізоўвацца навуковыя гурткі вучашчайся моладзі з чытаньнем рэфэратаў, дэмонстраваньнем прыбораў, арганізацыяй дасьледаў і т. д. Вучні могуць працаваць пры Ц. Ф. К. над выробкаю самадзельных прыбораў па фізыцы. Што ў этай справе вучні могуць дасягнуць вялікіх пасьпехаў, паказывае Пэдагогічная Выстава ў Рызе ў 1911 годзе, на якой асобнае месца было дадзена для вучняў, прапанаваўшых для выставы свае самадзельныя прыборы. Госьці зьдзіўляліся выдумчывасьці (изобретательности) і творчасьці маладых фізыкаў—любіцеляў. Былі выстаўлены паміж іншым: электрафорная машына з грамафонных пласьцінак, даваўшая іскру ў 10 см., лёгка зараджаныя элекрычныя машыны трэньням ад бутэляк, гальваномэтры, рэостаты, індукцыйныя катушкі з іскрай да 4 см., вельмі чулая модэль бяздротнага тэлеграфу і г. д. („Физическое Обозрѣние“ 1912 г., стр. 53).

10. Пры Ц. Ф. К. могуць адбывацца публічныя лекцыі па фізыцы і прыродазнаўству—сыстэматычныя, ці па асобных пытаньнях—для шырокае публікі.

11. З часам дзеяльнасьць Віленскага Ц. Ф. К-ту можа пашырыцца і на провінцыю.

А. Дмахоўскі.

19 7|I 21 г.
м. Вільня.

Зьмясьцаючы гэты артыкул ведомага у краі фізыка, рэдакцыя спадзяецца, што яго надта важны проэкт не застанецца без спагады з боку усіх тутэйшых пэдагогічных сіл, і Вільня у такой пільнай і патрэбнай справе без маруды пяройдзе ад слоу к дзелу.

Рэдакцыя.

Культурнае адраджэньне.

Цяпер у Вільні адбываюцца курсы беларусазнаўства для вучыцялёў, якія не праходзілі падобных курсаў. Сур'ёзныя адносіны слуханьнікаў да курсаў, шчырае зацікаўленьне роднай моваю, літэратурай і гісторыяй паказуюць, што мы маем дзела ня з прыпадкам сабранымі людзьмі, якія яшчэ ня ведаюць і самі, ці будуць яны працаваць на беларускай ніве ці не, а з вучыцялямі, што прыехалі з беларускіх школ.

Асабліва ўцеха бярэ, пачуўшы гутаркі паміж вучыцялёў, як вучанікі ў роднай беларускай школе робяць шмат большыя ўдачы, чымся ў даўнейшай маскоўскай, з якой ахвотаю, свабодна, бойка і так усё натуральна расказуюць, чытаюць, як усё выкладзенае ў роднай мове без натугі цемяць, як дзеці ў роднай школе, не калечачыся, свабодна разьвіваюцца, быццам тыя дагляданыя краскі, пасаджаныя ў гародчыку. Аб гэтым расказуюць на'т вучыцялі, што ўжо дзесяткі год працавалі ў чужой маскоўскай школе. Калі паўглядаешся на ўсё вучыцельства, з якога нат' старыя вучыцялі маскоўскіх школ шчыра робяць беларускую культурную работу, то робіцца ясным, што мы маем вялікі і добры грунт для свайго адраджэньня. Не загіне той народ, у сыноў, якога так глыбака і моцна сядзяць карані спачуцьця і любові да свайго роднага. Сьвядомасьць патрэбы роднае школы пераходзіць ад вучыцельства і наагул ад інтэлігенцыі да ўсяе народнае масы. Навет там, дзе бацькі спачатку касавурыліся на беларускую школу, цяпер, угледзіўшы, што дзеці ахватней, лепей і з большай карысьцяй вучацца ў гэтай школе, пачалі шчыра да яе гарнуцца. Дзе сяляне пазнаёміліся з беларускай школаю, там усюды просяць закласьці ў іх гэтую школу.

Ведама не абыходзіцца і бяз прыкрых здарэньняў. Прыкладам, у Лебедзеўскай вол. адна вучыцелька, зазлаваўшыся, што яе з прычыны няўменьня роднае мовы, не назначылі вучыцелькаю ў беларускую школу, самадумам заклала ў в. Насілаве маскоўскую школу. Сорам падобным вучыцялём! Роднае мовы можна навучыцца, але крыўды зробленай сваей Бацькаўшчыне ня вернеш. Духавенства, як каталіцкае, так і праваслаўнае так сама ў іншых мясцох адносіцца варожа да беларускае школы. Але народная хваля ўсе гэтыя перашкоды сатрэ і пойдзе ўперад сваёй вольнай шырокай дарогай.

Адылі ўглядаючыся на тое, што зроблена, мы мусім адцеміць, што работа яшчэ толькі ў самым пачатку, што і ў Сярэдняй Ліцьве толькі невялічкая часьць насяленьня ведае як закладаць беларускія школы, што і ня ўсё вучыцяльства аб гэтым ведае, што вучыцялі нат' ня ўсе зарэгістраваны. Зусім нягодна стаіць справа з „падкармленьнем“ або наагул з амэрыканскаю помачай. Так сама блага з школьнымі кнігамі і ўсялякімі падмогамі. А што-ж казаць аб тым, як стогне Лідчына і Горадзенскі павет. Што казаць аб тым вялізарным прасторы Беларусі, што цяпер згодна з рыскім трактатам займаюць палякі і адкуль надта мала чуваць аб школах. Падумаўшы аб усім гэтым, мусім сказаць, што патрэбна самая шырокая, энэргічная і ўсестароньняя праца. Павінны гэтым заняцца як найуважней і кіруючыся нашыя сфэры і ўсё грамадзянства. Пара, даўно пара стварыць такую школьную арганізацыю, якую маюць чэхі, украінцы, палякі і іншыя народы, трэба стварыць т-ва „Беларуская Школа“, якое абняло-б усіх чыста сьвядомых беларусаў. Але аб гэтым у чарговым №.

Крывіч

КРОНІКА.

Елкі у беларускіх школах.

31 сьнежня ў беларускай школе ля 2-ое Радунскае вул. ў Вільні была ўладжана елка для дзяцей. Цікаўную праграму дзеці вельмі добра выпаўнілі. Гульня была пачата пяяньнем „Не пагаснуць зоркі ў небе“... Далей дзеці вельм, добра прапяялі некалькі народных песьняў. Тыпова беларускім было выступленьне дзяцей—калядоўшчыкаў, якія пялі калядныя песьні. Дзяцем былі раздадзены падаркі (большым кніжкі, меншым цукеркі).

10 студня адбылася елка для вучняў у Віленскай Белар. Гімназіі. Пасьля агульнай гульні ўсіх дзяцей добра накармілі; большым з іх была раздадзена сьвяточная кніжка „Каляда“, прысланая „Беларускім Словам“ з Горадні.

Экономічны Аддзел.

— У іншых мясцох края ужо цяпер выясьнілася, што на вясну у сялян будзе вялікая недахватка насеньня: аусу, ячменю, а у іншых мясцох навет і жыта. Дужа вялікая патрэба у мінэральных удабрэньнях.

— У Вялейскім павеце апошні час зьяуляецца значны лік мяшочнікау з Вільні. Мяшочнікі выменіваюць у селян тавары прывезеныя з Вільні на тавары селянскай гаспадаркі і запаўняюць сабой усе вагоны у поезьдзе. Жандары змагаюцца з гэтым находам мяшочнікау, лік якіх усе павялічываецца.

— Віленскі Саюз Коопэратывау закупіу у Ковенскай Ліцьве 10 вагонау солі. Ковенскі Урад выдау дазваленьне на правоз гэтых вагонау па вялезнай дарозе да граніцы Сярэдней Літвы.

— Соль, атрыманая Дэпартамэнтам Апрaвізацыі, дзеліцца пакуль што толькі сярод жыхароу Вільні па 2 фунты на сябра коопэратыва. Для весак Дэпартамэнт мае намераньне за грошы пакуль што не даваць, а даць толькі у абмен на збожжа.

— З Вялічкі адпраулены па адрэсу Віленскага Саюзу Коопэратывау трыццаць вагонау солі па разьверстцы за сьнежань.

— „Віленскае Слова“ паведамляе, што: урад арганізуе грамадзкія (общественныя) работы па разработцы лясоу. Да лютага можаць быць загатоулена 60 тысяч сажняу дроу.

Відочна гэтыя дровы у такім значным ліку назначаюцца для вываза, бо Вільня у год патрабуе усяго толькі каля 30.000 кубоу.

— Дэпартамэнт Апрaвізацыі запрапанавау усім установам маючым цэнтральнае атапленьне перайсьці на торф замест дроу.

— На вучыцельскіх беларускіх курсах якія цяпер адбываюцца у Вільні, курсантам тлумачыцца між іншым і коопэрацыя: як весьці коопэратывы і як іх арганізаваць.

— Віленскі Саюз Коопэратывау прадау таварау у працягу сьнежня месяца 1920 года каля 7 мілёнау марак; у саюз зьявіліся з разных паветау 95 коопэратывау, якія забіралі тавар 258 разоу, такім родам у Саюзе кожны дзень бывала у сярэднім 11 таварыств.

— У аколіцах Віцебска пушчаны у ход шкляны завод з праізводствам 4000 скрынак ваконнага шкла кожны год.

У Кемелішках.

Замест быушай коопэратывы, якая вялася панам Казлоускім, сьвядомым тут красавым дзеячам, незадаволеныя селяне закладаюць новую коопэратыву.

У Клюшчанах.

Ад восені 1919 года існавала таварыства пад назвай „Jednaść“. У таварыстве працавау ксендз і пры ім справы шлі, але апошні час у урад выбраны шляхціц Белевіч, які уздумау у коопэратыву прывазіць для прадажы гарэлку. Завеуся звычай з рахунковых кніжак выдзіраць ліст і мовы аб рахунковасьці у гэтым таварыстве і быць ня можа. На шчасьце агульны сход парашыу зьліквідаваць такое таварыства, а замест яго залажыць новае з паямі 250 мар. і уступн. 25, і абабраны новы урад.

Провінцыяльны аддзел.

Веска Адамчукі, Віленскага пав. Міцкунскай гміны.

Вёска нашая хоць малая, але затое ўдалая. Яна перш, чымся другія вёскі, зразумела, што патрэбна асьвета для нашага цёмнага мужыка, а патрэбна яна для нас у роднай зразумелай беларускай мове, дзеля чаго тут істнуе другі год беларуская школа.

Ураджай сёлета зусім благі: жыта вымерзла, хлеба ня хопіць да другога. Цяпер ужо некаторыя людзі жывуць мякінай. Сенакос таксама благі, сена ня хопіць, а тут яшчэ рэквізіцыі пазабіралі даастатку, — людзі прадаюць апошнюю скаціну.

Доктарскай помачы блізка ніякай няма, людзі хварэюць і ўміраюць бяз жаднай помачы. Пошта ня ходзіць і беларускія газэты праз пошту намі не дастаюцца. Сярод тутэйшых сялян пашыраецца газэта „Krynica“, бо людзі тут усе каталікі. Беларуская нацыянальная сьвядомасьць стаіць добра, гэта відаць з таго, што ўлетку на сорахгадзіннае набажэнства тутэйшыя сяляне дамагаліся казаньняў у беларускай мове.

Адамчуцкі Небарака.

М. Лужкі, Дзісьненскага пав.

У нас наагул беларускае жыцьцё туманнае, як відаць хоць-бы з таго, што, калі прышлося адчыняць школу, то народ завёў спрэчку; каталікі хацелі польскай школы, а праваслаўныя рускай і вышла так, што большы і выгаднейшы пад школу будынак заняло войска пад склад, а дзьве школкі руская і польская памясьціліся ў горшым будынку.

Коопэратыў таксама хоць істнуе, але разьвіцьцё яго труднае дзеля далёкай дастаўкі тавараў, тым больш, што за тавары трэба плаціць збожжам, якое трудна даставіць у Вільню. Напрыклад, цяпер, 19 сьнежня б. г. прадстаунікі коопэратыва ў Лужках вязьлі 60 пудоў жыта і мелі пропускі, а ня гледзячы на тое ў м... нейкі паручнік зрэквізаваў гэтае збожжа; тады яны ўдаліся да Магістрату места і ім удалося адабраць збожжа ад войска, але з варункам, што не павязуць у Вільню, а заменяць у мясцовым коопэратыве на газу (нафту). Вышла ім гэта шмат даражэй, бо далі па 2 п. 35 ф. жыта за 1 пуд газы.

Коопэратар.

Веска Скайсьцеры Міцкунск. гміны, Віленскага павету.

Гэтая вёска бадай самая вялікая ў нашай гміне. Пры немцах тут быў пажар, згарэла многа хат. Цяпер людзі адбудаваліся нанова і жывуць нязгорш. Жыхары ўсе беларусы-каталікі. Сьвядомымі ня хочуць быць затое, што баяцца, каб ня быць „рускімі“. Гэтак навучаюць тут нас і агітатары, каторых астатні час прыспорыла. Яны нам дэкляруюць зямлю, навет бяз грошы, і волю бяз усякага ўпіску. Але гэта ўжо ня першы раз, так што выходзе „абяцанка-цацанка, а дурному радасьць“.

Газэтаў тут людзі ня чытаюць. А калі і чытаюць, то нічога не разумеюць бо папольску тут не гавораць. Есьць тут школка польская, у якой вучаць, як любіць Польшчу, а свайго забывацца. Есьць тут свой сьлесар, які цяпер займае месца гміннага войта. Ен ненавідзіць беларусаў, хоць сам у той вёсцы сьвіньні пасьвіў, але пабыўшы ў салдатах выракся свайго. Есьць свой вясковы могільнік, на каторым пахаваны вядомы Антон Чарняўскі, найбольшы чалавек на ўсю Эўропу, вагаю 18 пудоў.

Жыцьцё вёскі нашай не найгоршае, бо людзі працавітыя. А хто працуе, той і мае,—кажа народная прыказка.

Качарга.

Беларускі Вучыцельскі Саюз Крайскай вол. Вялейскага п.

5-га кастрычніка 1920 г. былі закладзіны гэтага саюзу.

Старшынёю Саюзу абраны Віктар Таразэвіч, пісарам В. Каранеўскі і скарбнікам Зося Вінча.

Пры вельмі трудных варунках прыходзіцца працаваць сябрам Саюзу. Ня маючы падмогі ад цэнтральных арганізацый, пры зруйнаваных, паруханых школах, пераживаючы розныя акупацыі, трэба даць школу дзяцём, каторыя ўжо на некалькі гадоў ня бачылі друкаванага слова. На складчыны, ахвяры і даходы ад спэктакляў і на надзею ў будучыне адчыняюцца школы. Адно, што маюць вучыцялі — гэта дармавыя харчы ад сялян.

Сёлета Саюзам адчынена ў Крайскай воласьці 9 пачаткавых беларускіх школ:

1) м. Крайск, 115 дзяцей, вучыцялі В. Таразэвіч і З. Вінча; 2) в. Дзярэўня, 51 дзяцей, вуч. П. Ждан; 3) в. Грыневічы, 45 дз., вуч У. Таразэвіч; 4) в. Дзьвінасы, 40 дз., вуч. І. Таразэвіч; 5) в. Задозьдзе, 30 дз., вуч. Л. Родзевіч; 6) в. Стрыі, 21 дзяц., вуч. Я. Кальвінкоўскі; 7) в. Баброва, 16 дзяц., вуч. І. Рукоўскі; 8) в. Забалоцьце, 15 дз., вуч. М. Ганаўчынскі і 9) в. Хадасы, 25 дзяц., вуч. У. Каранеўскі.

З другіх суседніх воласьцяў просяць Саюз даць вучыцялёў адчыніць школы, але ці нястача ідэйных людзей ці матар'яльныя перашкоды спыняюць працу.

Бадай кожная школа мае невялічкую кніжніцу (бібліатэку) з якое пазычаюцца вучанікам і выраслым кнігі. У в. Хадасох адчынены курсы граматы для дарослых—слухальнікаў 23. Цяпер Саюз прыступіў да выпаўненьня формальнасьцяў, каб адчыніць курсы беларусазнаўства ў м. Крайску. Апрача таго Саюзам было згуляна ў апошнія часы 3 спэктаклі. Гулялі: „Маньку“ і „Птушку шчасьця“ Пранцішкі Аляхновіча, „Антось Лата“ Тараса Гушчы, а цяпер ладзяць гуляць „Конскі патрэт“ жарт Л. Родзевіча і дзіцячы спэктакль.

Тутэйшым земляробам Саюз даў ініцыятыву закласьці Сельска-Гаспадарскае Таварыства, якое было вельмі спагадна сустрэчана.

Асабліва важна было-б зрабіць у Крайску культурна-асьветны беларускі цэнтр, які стаяў-бы ў абароне ўсіх беларускіх інтарэсаў, як у кутку далёка закінутым ад галоўных адміністрацыйных цэнтраў (усход Вялейскага павету).

НОВАЯ КНІГА
К. ДУШЭЎСКІ.
„Беларусь і польска-маскоускі прэлімінарны мір“.
Выдзержкі з рэферату, чытанага аутарам на беларускай нацыянальна палітычнай конфэрэнцыі.
НЕЗАБАВАМ ВЫЙДЗЕ з ДРУКУ.

НАВІНКА! НАВІНКА!
КАЛЯДА
сьвяточная кніжка для
беларускіх дзетак
Прадаецца у Беларускай Кнігарні, Вільня, Завальная, 7. — — Цана 1. марак.

Доктар А. Краскоускі
(агульная мэдыцына)
Вострабрамская, 20, кв. 6 ад 4—6 гадз.

МЕНСК.

Беларускі рабочы клюб.

Беларускі рабочы клюб (на Юраўскай вуліцы, быўш. „Акварыум“), арганізован беларускімі соцыялістамі-рэвалюцыянэрамі. Па ліку сваіх сяброў (каля 500) ён зьяўляецца самым большым клюбам у Менску. Ня гледзячы на благія матар'яльныя варункі, клюб працуе усё-ж ткі добра. Мае пад кіраўніцтвам вядомага бел. драматурга Ул. Галубка сваю драматычную трупу і даець па колькі разоў у тыдзень спэктаклі. Мае добрую бібліатэку. У клюбе адбываюцца лекцыі. У хуткім часе клюб адкрывае для сваіх сяброў агульныя курсы беларусазнаўства. Трупа Галубка на сцэне Беларускага рабочага клюбу ня дужа даўна ставіла ў першы раз дзьве новых п'есы Галубка: *„Завяушыя кветкі“* (драма у 3 дз.) і *„За мураванай сьцяной“* (у 1 дз.).

Беларускі Дзяржауны Тэатр.

Беларускі Дзяржаўны тэатр складаецца з трох сэкцый: беларускай, расейскай і жыдоўскай. У беларускай працуюць Аляхновіч, Галубок і Ждановіч. Беларускія спэктаклі адбываюцца па 2 і 3 разы у тыдзень, публіка імі вельмі цікавіцца, і тэатр заўсегды перапоўнены. Пры тэатры ёсьць сэкцыя балету, на чале з балярынай Нежынскай.

Тэатр *).

Усякае мастацтва, ня гледзячы на тое, як яно будзе выяўлена, поэзіяй, музыкай, фарбай на паперы ці палатне. створаным на сцэне тыпам ці як вежа ў будыніне—заўсёды адбівае ў сабе лепшыя людзкія мары і мысьлі. Мастацтва ёсьць тое люстэрка, у якім адбіваюцца ўсе лепшыя думкі і мары народу, з гушчы якога выходзіць мастак.

Дзеля гэтага па мастацтву ўсягды можна меркаваць аб ўсіх згібах людзкой душы. Вынятку ў гэтым ніколі ня бывае. Дык калі хто хочаць пазнаць які-небудзь народ ня толькі зьверху, але і бліжэй, той мусіць пазнаць яго мастацтва. Зрабіць гэта можна ходзячы ў музэі і тэатры. Тэатр, як нельга лепей, рысуе ўсе звычаі народу і зьвязанае з ім характво народнай душы. У тэатры найзручней можна пачуць чыстую мову, убачыць нацыянальную асаблівасьць ў адзежы і т. д. і т. д. Навет у тым, з якой стараннасьцю бывае зроблена адзежа артысты, як паложан грым, зашпілены боты і іншых, здавалася-б, малых драбязах, чалавек знаходзе заўсёды многа матар'ялу для характарыстыкі ня толькі самога артысты, але і ўсяго народу. Адгэтуль ня трудна бачыць, што абавязкі, якія самі сабой кладуцца на мастака—артысту. ня ёсьць лёгкія, і каб іх выканаць, ён патрабуе патраціць багата сваей энергіі. У свой твор ён павінен ўлажыць ўсе свае сілы, павінен абдумаць кожную дэталь і толькі пасьля гэтага паказаць свой твор людзём.

Што-ж мы бачым на сцэне Беларускага клюбу? У суботу 8 студня г. г. пад кіраўніцтвам пана Акушкі былі пастаўлены на сцэне „Сватаньне“ Чэхава і „Чорт і баба“ Ф. Аляхновіча. Рэчы гэтыя, як вядома, абедзьве дужа добра надаюцца для пастаноўкі на сцэне і лёгкія для зразумленьня. Пры гэтым як адна, так і другая, характэрны для беларускага жыцьця. Усё гэта давала магчымасьць выявіць пекнасьць, як чыста вясковой, так і больш „спанпчанай“ шляхоцкай беларускай мовы і звычаяў. Аднак, дзякуючы недагляду рэжысора, як у падборы артыстаў, так і ў кіраваньні іх рукамі, усё гэта было страчана.

Маладая п. Акушчанка, хоць можа і мае мастацкі дар, з першага сказанага на сцэне свайго слова, распалажыла публіку не на сваю карысьць. Чуючы яе мову здавалася, што рэжысор п. Акушка, даючы ёй роль, троху памыліўся і замест беларускага перакладу „Сватаньня“ Чэхава, даў ей расейскі арыгінал. Маладая-ж артыстка, як відаць, ня прывыкла яшчэ іграць пад суфлёра і мусіла сваю роль вывучыцца напамяць. Дзякуючы гэтаму, ў яе словах ня трэба было шукаць русіцызмаў, а трэба было шукаць беларусіцызмаў. Да віны, як артысткі, так і рэжысора, належыць яшчэ і тое. што п. Акушканка ня ўмее млець. Некаторыя падрабязкі ў недаглядзе ў вопратцы (блага зашнураваныя чаравікі і інш.) таксама ня можна паставіць ў прыклад як артыстцы, так і рэжысору. Відаць, наагул, што артыстка мала знаёма з вымаганьнямі сцэны і ў твораные праз сябе тыпы душы не ўкладае.

Маладому артысту Тальмашэўскаму роль бацькі удалася зусім добра, але тыя русіцызмы, якія час ад часу ў яго вырываліся, шмат псавалі ўражаньне. Наагул-жа п. Тальмашэўскі, як відаць, мае вялікія здольнасьці, каторыя пры добрым даглядзе могуць пекна расьцьвісьці. Добра-б было, каб гэта ўсё зразумеў сам мастак—артыста і не пажалеў троху працы на бліжэйшае знаёмства са сцэнай. Ад ўсей душы жычым яму выступаць часьцей на беларускай сцэне.

Пан Сасноўскі адзін з ўсіх артыстаў меў чыстую беларускую мову, якая асабліва прыгожа выдзялалася пасьля русіцызмаў п. Акушчанкі. Узятую на сябе роль залётніка ён выканаў, як для аматора, досыць няблага. Як відаць пан Сасноўскі мае не малыя мастацкія здольнасьці, каторыя, ўсе-ж-ткі, рэжысор не патрафіў разбудзіць ў ім так, як гэта было патрэбна. Будзем-жа, аднак, спадзявацца, што праз працу над самім сабой, пан Сасноўскі згладзіць бракі ў выкананьні ўзятых на сабе роляў: ў будучыне будзе аднэй з лепшых сіл нашага маладога тэатру.

Маленькі водэвіль Аляхновіча „Чорт і Баба“ прайшоў далёка лепей, чым „Сватаньне“, можа, навет дзякуючы таму, што п. Акушчанка мела ня першую роль і не магла так шкодзіць сваім расейскім духам. Аднак. радзіў-бы п. рэжысору ў будучыне такіх артыстак, катозамест „прадала ўсё“—кажуць „все продала“, на сцэну беларускую ня пушчаць. Ня можна ў прыклад паставіць і тое, што, як і рэжысор, так і артыстка ня знаюць, што вясковыя беларускія кабеты ў будні дзень чаравікаў на высокіх абсацах ня носяць. Што яны бываюць часам як папала зашнураваны, то я з гэтым згодзен. Сьмяяцца там, гдзе артыста павінен плакаць, ня згодна з назвай артысты.

Затое маладая наша пясьнярка і артыстка п. Арсеньнева ў сваёй ролі бабы была не да параўнаньня. Створаны праз яе тып сьведчыць аб тым, што апрача вялікай здольнасьці, якую п. Арсеньнева мае ў сабе, як артыстка, ў сваю роль яна ўлажыла душу, абдумала кожную дэталь яе і добра знае жыцьцё нашых вёсак. Блага, аднак, тое, што пан рэжысор забыўся, што апранаць усіх артыстаў трэба па аднаму сэзону. У гэтым выпадку п. Арсеньнева—сваей інтуіцыяй перайшла рэжысора, бо яе вопратка была больш зімовая (час ў які сяляне найчасьцей езьдзяць на торг). Затое муж з жонкаю былі апрануўшыся як на сенакос або жніва, калі праве ніхто на кірмаш з сялян ня езьдзе.

Пан Грышкевіч хоць і малады, але з сваей ролі чорта вывязаўся добра. Аднак, рука рэжысора сказалася і тут: чорт ў часе сваей першай гаворкі з бабай быў троху ня сьмелы, тады, калі яму сусім было прыстойна сесьці перад бабай на стале. Што ен пасьля баяўся бабы, то гэта зусім зразумела, але які ен у чорта чорт, калі раптам ні з таго ні з сяго баіцца бабы.

Што-ж тычыцца вопратак і грыму, то як тое, так і другое патрабуе, каб да іх адносіліся з большай увагай. Трэба помніць і аб тым, ў якую пору году адбываецца рэч, што чорт не патрабуе начэпліваць па сябе, гдзе трэба і ня трэба, гусарскія шнуркі, а скарэй зусім зашыецца ў уланскую скуру. Пры гэтым, мне здаецца, што праседзіўшы пад печчу блізка з год, ня будзеш мець чыстага твару, хоць-бы ў пекле і зусім ня быў.

В. Гр—іч.

*) Друкуючы гэтую рэч, Рэдакцыя зазначае, што ня зусім згаджаецца з некаторымі, болей вострымі закідамі аутора супроць нашых тэатральных дзеячаў, бо ен пры гэтым мала рахуецца з цяжкімі умовамі нашага адраджэньня наагул і адбудовы беларускага тэатра у Вільні між іншым.

Тутэйшае жыцьце.

„П а х о д н я“, орган Цэнтральнага Бюро Профэсіянальных Хаўрусаў м. Вільні, зьмесьціла ў № 11 пад загалоўкам „Беларускія дзеячы“ гэткую заметку: „З 24-сьнежня выйшаў № 1 беларускае тыднёўкі „Наша Думка“. Рэдактар-выдавец—п. М. Гарэцкі. „Наша Думка“ „надта задаволена“ беларуска-літоўскаю ўмоваю, зробленаю ў Коўні 12-га лістапада так званым беларускім урадам п. Ластоўскага, хаця п. Гарэцкі нядаўна яшчэ не хацеў мець нічога супольнага з „кулацкім“ літоўскім урадам. Некаторыя супрацоўнікі „Нашае Думкі“ пару тыдняў таму назад былі супрацоўнікамі „Нашае Нівы“, якая у сваім часе так захаплівалася авантурай Балаховіча. Калі, аднак, зорка таго авантурніка сьцямнела, „Наша Ніва“ пачала стыдліва адступаць, і некаторыя яе супрацоўнікі нарэшце апынуліся у перадпакоях „кулакоў“. Такія дзеячы ня могуць узбудзіць да сябе ніякае пашаны і веры“.

Гэтая заметка зьявілася праз няведаньне „Паходні“ аб беларускіх справах і яе крыўдную для беларусаў аднабокасьць у нацыянальным пытаньні, што ўжо раз, у адносінах да рэдактара „Кгупісу“, прымусіла яе пісаць зьняпраўджаньне (sprostowanie). Рэдакцыя „Нашае Думкі“, як ня мела, так і ня мае нічога супольнага з урадам Літоўскае Рэспублікі. Аб паглядах М. Гарэцкага на „кулакоў“, і ня толькі на літоўскіх, але на ўсякіх, навет на тых, што ўмеюць прымазацца ў работніцкія органы, найлепей сьведчуць яго творы, а не галаслоўныя абвінавачаньні. Што датыча „Нашай Нівы“, то яна сама сябе абароніць, хоць з свайго боку адкрыта заяўляем: мы нідзе ў ёй не знаходзілі захапленьня авантурай Балаховіча“. Зьвязываць яе імя з „Нашай Думкай“ з-за таго, што яны маюць супольных супрацоўнікоў у васобах нашых беларускіх поэтаў і пісьменнікаў, ня выпадае, бо маем справу з літэратурным матар'ялам, які падходзіць для той і той газэты, як, да прыкладу, вершы М. Канапніцкай падыйшлі для „Паходні“, а друкуюцца і ў варожых для яе органах. „Наша Думка“ маець двух супрацоўнікаў (Дзед Кузьма і т. Д), якія пісалі у „Паходні“, пакуль яна ня выдумала, што ёй быццам забараняюць пісаць пабеларуску. Урэшце спытаемся, якой пашаны варты, новыя кіраўнікі „Паходні“, што прэтэндуюць на соцыяльную сьвядомасьць, а сьвядома ці не сьвядома—іхная справа—робяць полёнізатарскую работу і тым чыняць вялікую духоўную крыўду беларускаму несьвядомаму пролетарыяту.

М. Г.

Пытаньне і адказ.

— Чаму польскія соцыялісты на віленскім групцы да партыйнага назову «П. П. С.» дадаюць «Б. і Л.» (Беларусі і Літвы)?

— Бо і ад Беларусі і ад Літвы хочуць адрэзаць па куску зямлі і разам з Вільняй далучыць да Польшчы!

Да моладзі.

Сусьветная вайна, прынесшая нашаму народу столькі няшчасьцяў, прынясла яму аднача́сна і веру ў сілу арганізацыі. Разумее гэта сяньня наш меставы работнік, зразумеў гэта ўрэшце і наш селянін, доказам чаго ёсьць сялянскія коопэратывы.

Адны мы, беларуская моладзь, апора і сіла будучыні, астаемся і на далей нядзеяльнымі.

Арганізацыя ў сіле зварухнуць нас з сягоньняшняга застою. Арганізацыя дасьць нам магчымасьць паразумецца і злучыцца дзеля супольнае працы.

З нашых віленскіх арганізацый—„Грамада Беларускай Моладзі ў Вільні“ заложана ўвосені 1919 г. і мае тры сэкцыі: а) літэратурна-навуковую, б) музыкальную і в) драматычную. Усякія перавороты разагналі на ўсе староны сяброў Грамады, а таксама і яе прэзыдыум. Сягоньня таварыства гэта фактычна ня існуе, хоць яно і ня ліквідавана.

„Беларуская Вучнёўская Грамада“ заложана ўвосені 1920 году. Есьць проэкт залажыць „Беларускую Вучнёўскую Чытальню, гдзе-б маглі зьбірацца маладыя сілы. Ініцыятыву арганізацыі бярэ на сябе група вучняў 1-е Віленскае Беларускае гімназіі, з якімі можна паразумецца праз рэдакцыю „Нашае Думкі“. Дык заклікаема вас, беларуская моладзь, арганізуймася!

Б. В. Г.

Вільня
5 студня 1921 г.

Галоуны Выбіральны Камісарыят прыслау у рэдакцыю просьбу аб надрукаваньні гэткіх камунікатау:

1. Галоўны Выбіральны Камісарыят падаець да агульнага ведама, што ад 16 да 19 студня г. г. усе, маючыя права галасаваньня па моцы арт. 1-га пастановы аб выбарах, могуць перавяраць сьпіскі выбаршчыкау сваей акругі і падаваць заявы з прычыны няўпісаньня іх у сьпісак, або жадаць вычырківаньня са сьпіску нямаючых права галасаваньня.

Заявы трэба падаваць Акружнай Выбіральнай Камісіі.

2. Галоўны Выбіральны Камісарыят падаець да агульнага ведама, што згодна з арт. 37 дэкрэту № 21 Начальнага Даводцы Войск Сярэдняй Літвы аб пастанове выбарау у Сойм, 19-га студня г. г. канчаецца тэрмін агалашэньня кандыдатау у Сойм.

Усе палітычныя партыі, нацыянальныя групы, грамадзкія арганізацыі, таксама асобныя групы грамадзян у ліку 50, каторыя хочуць пры выбарах у Сойм выставіць свае уласныя сьпіскі, павінны, найпазьней 19 студня падаць іх у паказанай форме (дадатак № 3 да паст. аб выб.) на рукі загадчыка Акружной Выбіральнай Камісіі.

Kalendar „KRYNICA“
na 1921 hod.
WILNIA, Zawalnaja, 7

ДА ГОРАДЗЕНСКІХ ГАЗЭТ

Просіма надрукаваць што: Аляксей Барысавіч ВАРЭЦ Горадзенскай губ. і павету, Каменскай вол., забіўся ў Шахтах і пахаваны ў вёсцы Вайтлінген, крайс Цэлле, правінцыя ГАННОВЕР. Аб гэтым даносіць Аляксей Закаблук з Ставропольскай губ., Благадарнінскі пав., вёск Малое Ягурскае.

Для ведама вясковых коопэратывау.

Віленскі Саюз Коопэратывау

маець сваю кантору і склады ў Вільні, на вуліцы:

Малая Пагулянка, д. № 12, на рагу Каўкаскай вуліцы і Тэатральнай.

Са складу выдаець за грошы і на замену за збожжа: цукер, селядцы, карасіну, падэшву, цьвякі, лакцёвы тавар, шкло аконнае, папіросы, паперу, сшыткі, (цятрадкі). гузікі, іголкі, грабяні і ўсе патребнае да ўжытку.

Усім, хто цікавіцца—што такое коопэрація, і хто ахвоціцца грамадзкай працай заняцца—у САЮЗЕ ЗАДАРМА МОЖНА МЕЦЬ ПАРАДУ. Тут жа ЕСЬЦЬ КНІЖКІ, патрэбныя для коопэратыўных дзеячаў і для коопэратыўных Таварыстваў. Інструктора, каторы дапамагаець навукай і радай, можна задарма выпатрабаваць з саюза на месца, дзе зьбіраецца злажыцца коопэратыўная Грамада.

Дазволена Ваеннаю Цэнзураю. Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ Кооп. ДРУК“, Вострабрамская 5.